идеологии — одна из основных задач воспитания [25]. Воспитание патриота предполагает преобразование его знаний в глубокие убеждения, которые могли бы быть применены в его практической деятельности. Патриотизм только тогда становится убеждением, когда закрепляется индивидуальным опытом, становится нормой патриотической деятельности. Патриотизм как элемент мировоззрения и духовная культура личности взаимосвязаны, являясь неотъемлемым её качеством.

**Заключение.** На основании исследования сформулированы следующие выводы:

1) патриотизм представляет собой глубокую традицию отечественной гуманитарной науки и культуры. Он всегда рассматривался как необходимое условие силы народа, единства и величия государства. При этом сущность патриотизма по-разному трактовалась различными мыслителями, прежде всего, в плане его духовного выражения и реально-действенного проявления;

2) в содержание патриотизма как категории социальной философии входит четыре основных элемента: патриотическое сознание, патриотическая деятельность, патриотические отношения и организации. Функции патриотизма могут быть сведены к следующим: мировоззренческой, методологической, коммуникативной, регулятивной, ценностной;

3) социокультурные условия современной Беларуси позволяют молодому человеку по-новому взглянуть на свою страну, глубже осмыслить личную сопричастность к её истории и культуре, осознать свою роль в укреплении и развитии Отечества. Формирование настоящего патриота предполагает преобразование его знаний в глубокие убеждения, которые могли бы быть применены в его практической деятельности. Патриотизм только тогда становится убеждением, когда закрепляется индивидуальным опытом.

**Список цитируемых источников**

1. Азарова А. В. К вопросу об истории развития идеологии патриотизма в России // Вестник Военного университета. 2010. № 3 (23). С. 21—25.
2. Цицерон М. Т. Диалоги: О государстве; О законах. М. : Наука, 1994. 224 с.
3. Гегель Г. В. Ф. Работы разных лет : 2 т. // сост., общ. ред. А. В. Гулыгин. М. : Мысль, 1971. 209 с.
4. Азарова А. В. К вопросу об истории развития идеологии патриотизма в России. С. 24.
5. Губанов Н. И. Отечество и патриотизм. М. : Политиздат, 1960. 34 с.
6. Азарова А. В. К вопросу об истории развития идеологии патриотизма в России. С. 23.
7. Белинский В. Г. Полное собрание сочинений : в 13 т. М., 1954. Т. 4. 674 с.
8. Азарова А. В. К вопросу об истории развития идеологии патриотизма в России. С. 23.
9. Там же. С. 23.
10. Волков С. Николай Александрович Бердяев // Советский патриот. 1990. № 21. С. 12—17.
11. Концепция непрерывного воспитания детей и учащейся молодежи [Электронный ресурс] : утв. постановлением М-ва образования Респ. Беларусь, 15.06.2015, № 82 // Нац. образоват. портал. 2016. URL: http://adu.by/?p=7769 (дата обращения: 02.03.2016).
12. Ожегов С. И., Шведова Н. Ю. Толковый словарь русского языка : 80 000 слов и фразеологических выражений. 20-е изд. М. : Азбуковник, 1999. 944 с.
13. Современный энциклопедический словарь / под ред. А. М. Прохорова. 2-е изд. М. : Совет. энцикл., 1982. 1 120 с.
14. Политический энциклопедический словарь / отв. ред. и сост. Ю. И. Аверинцев. М. : Изд-во Моск. коммерч. ун-та, 1993. 988 с.
15. Волков И. Не быть иностранцами в своем Отечестве // Ориентир. 1998. № 3. С. 7—9.
16. Дьяченко В. В. Современные проблемы патриотического воспитания учащейся молодёжи. М. : Наука, 1999. 98 с.
17. Ипполитова Н. В. Теория и практика подготовки будущих учителей к патриотическому воспитанию учащихся : автореф. дис. … д-ра пед. наук : 13.00.01. Челябинск, 2000. 24 с.
18. Суколенов И. В. Теория и практика гражданского образования : автореф. дис. …д-ра пед. наук : 13.00.01. М., 2001. 37 с.
19. Философская энциклопедия : в 5 т. / под ред. Ф. В. Константинова. М. : Совет. энцикл., 1960—1970. Т. 4. 592 с.
20. Философский энциклопедический словарь / гл. ред.: Л. Ф. Ильичёв, П. Н. Федосеев [и др.]. М. : Совет. энцикл., 1983. 840 с.
21. Андре Конт-Спонвиль Этерна. Философский словарь. М. : Этерна, 2012. 502 с.
22. Социальные технологии. Толковый словарь / под ред. В. Н. Иванова. Белгород : Луч—Центр социальных технологий, 1995. 978 с.
23. Цицерон М. Т. Диалоги: О государстве; О законах. С. 132.
24. Ильичёв Н. М. О сущности, содержании и значении патриотизма // Вестник Российского философского общества. 2002. № 3. С. 84—92
25. Концепция непрерывного воспитания детей и учащейся молодёжи.

УДК 122/129

**М. П. Саўко**
*Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны медыцынскі універсітэт», Мінск*

# ТЭРЫТОРЫЯ ЯК ФАКТАР ФАРМІРАВАННЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ САМАСВЯДОМАСЦІ

**Уводзіны.** Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці і ідэнтычнасці беларускага народа з’яўляецца вельмі важным і актуальным, асабліва ва ўмовах існавання суверэннай незалежнай рэспублікі. У сацыяльна-палітычнай літаратуры прац, прысвечаных гэтаму пытанню недастаткова. Аўтар спрабуе на падставе вядомых фактаў разгледзець праблему праз прызму тэрыторыі пражывання беларускага народа.

**Асноўная частка.** Тэрыторыя з’яўляецца адной з галоўных умоў існавання і прызнання сусветнай супольнасцю незалежнасці дзяржавы. Ёсць тэрыторыя — ёсць падстава для дзяржавы. Красамоўна на гэта была

© Саўко М. П., 2016

Репозиторий БарГУ

звернута ўвага дэлегацыі Беларускай Народнай Рэспублікі (далей — БНР) на чале з А. Луцкевічам у 1919 г. на Парыжскай мірнай канферэнцыі. На просьбу падтрымаць зварот аб прызнанні БНР дэлегацыі Міністэрствам замежных спраў Францыі было сказана, што «калі б вы мелі хоць кавалачак зямлі дзе былі б вы гаспадарамі, пытанне аб міжнародным прызнанні незалежнай Беларускай Народнай Рэспублікі было б вырашана станоўча, і вам была б дана дапамога» [1]. Такая заява была звязана з тым, што на тэрыторыю пражывання беларусаў яшчэ раней прэтэндавали дэлегацыі суседніх дзяржаў. У прыватнасці, літоўскі нацыянальны рух, які быў сфарміраваны раней за беларусаў, 11 студзеня 1917 г. у Жэневе распаўсюдзіў сярод дыпламатаў «Мемарандум аб аднаўленні незалежнай Літвы». Спасылаючыся на гістарычныя правы, літоўцы аб’яўлялі Літоўскую дзяржаву ў межах Віленскай, Ковенскай, Гродзенскай, Сувалкаўскай, Курляндскай губерняў, а таксама Навагрудскага павета Мінскай губерніі і паўночнай часткі Ломжынскай губерні да ракі Лык і Нараў [2]. На Заходнія тэрыторыі Беларусі прэтэндавала адноўленая Польская дзяржава, паўднёвыя — Украінская Народная Рэспубліка, усходнія — Расія. У выніку атрымлівалася што ў беларусаў увогуле сваёй зямлі не існавала.

Але гэта не так. Тэрыторыя пражывання беларускага народа склалася яшчэ ў даўнія часы. Больш выразна яна вызначалася ў часы стварэння і дзейнасці беларускай цэнтралізавай дзяржавы — Вялікага Княства Літоўскага са сталіцай ў горадзе Навагрудку, потым у Вільні, а не ў якім-небудзь Алітусе ці Шаўляі. Гэта тэрыторыя складвалася вякамі, на ёй сфарміраваўся характар дзейнасці нашага народа, яго матэрыяльная і духоўная культура, асаблівасці побыту і мовы, звычаяў і рэлігійных вераванняў. Складваўся свой адметны менталітэт, светапогляд. Тэрыторыю сваёй жыццядзейнасці нашы продкі не толькі акультурылі, зрабілі прыгоднай для жыцця, але і паспяхова абаранялі яе ад нападаў мангола-татар, крыжакоў, амаль 300 гадоў ад Маскоўскай дзяржавы. Са стратай беларускім народам сваёй дзяржаўнасці ў 1795 г. яго зямля, тэрыторыя пражывання ператварылася у разменную манету больш моцных суседзяў. Ужо ў часы знаходжання ў складзе Расійскай імперыі змяняліся не на карысць беларусаў адміністрацыйныя межы, у мэтах поўнай інкарпарацыі вынішчалася гістарычная назва краіны, гістарычныя сімвалы, нацыянальная мова, фальклор.

У XIX — пачатку XX ст. з выспяваннем нацыянальнай ідзеі, станаўленнем новай (пастаянна знішчаемай) нацыянальнай інтэлігенцыі больш дакладна вызначалася тэрыторыя пражывання беларусаў. У працах М. У. Доўнар-Запольскага, Я. Ф. Карскага, Н. Я. Нікіфароўскага, Е. Р. Раманава і іншых навукоўцаў былі вызначаны дакладныя этнаграфічныя і гістарычныя межы пражывання беларускага народа. Найбольш грунтоўна яны акрэслены ў «Этнаграфічнай карце беларускага племені», складзенай Я. Ф. Карскім і ўдакладненай М. У. Доўнар-Запольскім. Яны вызначылі, што тэрыторыя пражывання беларусаў уключае не толькі спрадвечна беларускія землі, а таксама шэраг суседніх раёнаў Віленскай, Калужскай, Ковенскай, Курляндскай, Арлоўскай, Пскоўскай, Смаленскай, Цвярской, Чарнігаўскай губерняў. Вынікі даследавання навукоўцаў былі выкарыстаны пры вызначэнні межаў стваральнікамі БНР і пры першым абвяшчэнні Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь (далей — ССРБ) і нават Заходніх абласцей бальшавікамі 27 лістапада 1917 г. Бальшавікі ў склад Заходняй вобласці ўключалі Віленскую, Віцебскую, Гродзенскую, Ковенскую, Магілёўскую, Мінскую і Смаленскую губерні. Іх тэрыторыя складала звыш 300,0 тыс. кв. км з насельніцтвам 15,0 млн чалавек [3, с. 252]. Увогуле кампактная тэрыторыя пражывання беларусаў, па падліках навукоўцаў, складае 337,0 тыс. кв. км.

Маніпуляцыі з тэрыторыяй пражывання нашага народа працягваліся. У склад створанай бальшавікамі ЛітБел уключаліся Віленская, Гродзенская, Мінская, Ковенская і частка Сувалкаўскай губерняў. Астатнія землі аб’яўляліся расійскімі [4, с. 304].

Пасля заканчэння савецка-польскай вайны і падпісання Рыжскага мірнага пагаднення 18 сакавіка 1924 г. беларускія землі без удзелу беларускага народа падзялілі на тры часткі. Адна з іх — Заходняя Беларусь — адышла Польшчы, Усходняя — РСФСР, а ў цэнтральнай частцы на стыку Польшчы і Расіі аднаўляецца буферная ССРБ (другое абвяшчэнне) у складзе шасці ўездаў Мінскай губерні плошчай 52,4 тыс. кв. км і насельніцтвам 1,6 млн чалавек [5, с. 316]. Такі падзел тэрыторыі пражывання беларусаў можна патлумачыць, у тым ліку, слабасцю нацыянальнай палітычнай эліты, яе раздробленнасю і існваннем ў яе складзе вялікай колькасці не беларусаў, і, як вынік усяго гэтага, няздольнасцю адстойваць нацыянальныя інтарэсы, тэрытарыяльную цэласнасць беларускага народа. У Беларусі пасля 1917 г. кіруючыя пасады займалі армянін А. Ф. Мяснікоў (Мяснікян), латыш В. Г. Кнорын (Кнорыньш), паляк У. А. Багуцкі, ураджэнец Краснадарскага краю П. К. Панамарэнка і іншыя (з усіх кіраўнікоў адзіным беларусам быў В. Ф. Шаранговіч), і памкненні беларускага народа жыць разам у адной сям’і, адной дзяржаве іх мала цікавілі. Раз’яднанне тэрыторыі на часткі не садзейнічала кансалідацыі беларускага народа, яго эканамічнаму і духоўнаму развіццю, перашкаджала фарміраванню адзінай нацыянальнай самасвядомасці, цвёрдай упэўненасці ў будучыні.

Пасля стварэння СССР 30 снежня 1922 г. ССРБ была ператворана ў Беларускую Савецкую Сацыялістычную Рэспубліку (далей — БССР). У БССР, якая па тэрыторыі ўяўляла губерню, адсутнічала магчымасць паўнавартаснага эканамічнага, палітычнага і нацыянальна-культурнага развіцця. Улічваючы гэта, беларускія дзеячы А. Чарвякоў, У. Ігнатоўскі і іншыя неаднаразова звярталіся да савецкіх уладаў з просьбай аб вяртанні ў склад БССР усіх беларускіх зямель.

3 сакавіка 1924 г. Прэзідыум Цэнтральнага выканаўчыга камітэта СССР прыняў пастанову аб першым узбуйненні БССР. Паводле яе да рэспублікі адыходзілі часткі Віцебскай, Смаленскай і Гомельскай абласцей. У выніку вяртання гэтых тэрыторый плошча Беларусі павялічылася больш чым у два разы і склала 110 584 кв. км. Колькасць насельніцтва дасягнула 4,2 млн чалавек.

Першае ўзбуйненне толькі часткова вырашала пытанне аб межах БССР. Таму 18 лістапада 1926 г. прымаецца пастанова аб другім узбуйненні Беларусі. Рэспубліцы вярнулі Гомельскі і Рэчыцкі паветы, тры паветы былой Віцебскай і чатыры паветы былой Чарнігаўскай губерняў. У выніку гэтага плошча БССР узрасла яшчэ на 15 727 кв. км,

Рэпазіторый БарДУ

а насельніцтва — на 649,0 тыс. чалавек. У пачатку 1927 г. тэрыторыя Савецкай Беларусі складала 125 950 кв. км з насельніцтвам каля 5,0 млн чалавек, 80% якіх былі беларусы. Разам з гэтым значныя плошчы тэрыторыі, населеныя пераважна беларусамі, заставаліся па-за межамі рэспублікі.

23 жніўня 1939 г. было заключана пагадненне аб ненападзе паміж Германіяй і СССР тэрмінам на 10 гадоў. У адпаведнасці з сакрэтнымі дадаткамі да яго Заходняя Беларусь пераходзіла ў сферу уплыву СССР. Сюды пасля пачатку Другой сусветнай вайны 17 верасня 1939 г. былі ўведзены савецкія войскі. 2 лістапада гэтага ж года на V нечарговай сесіі пасяджэння Вярхоўнага Савета СССР быў прыняты закон аб уключэнні Заходняй Беларусі ў склад БССР. У выніку гэтага плошча рэспублікі ўзрасла да 225,6 тыс. кв. км, а насельніцтва — да 10,3 млн чалавек. Уз'яднанне Заходняй Беларусі з Савецкай Беларуссю мела вялікае гістарычнае значэнне ў кансалідацыі беларускай нацыі, яе эканамічным і духоўным развіцці, фарміраванні адзінай нацыянальнай самасвядомасці, сваёй ідэнтычнасці.

Аднак радасць беларусаў ад уз'яднання была нядоўгай, гандаль беларускай тэрыторыяй працягваўся. 10 кастрычніка 1939 г. савецкае кіраўніцтва з мэтай замацавання «дружбы» падпісала пагадненне аб перадачы Літве горада Вільня з Віленскай вобласцю. Пасля перадачы выключна беларускіх зямель савецкай уладай былі затрыманы лідары беларускага нацыянальнага руху Западнай Беларусі А. Луцкевіч, У. Багдановіч, Я. Пазняк і многія іншыя. У Вільні быў праведзены літоўскімі нацыяналістамі яўрэйскі пагром. Пры перадачы В. Молатаў заявіў: «Савецкі Саюз пайшоў на перадачу Вільні Літоўскай Рэспубліцы не таму, што ў ёй пераважае літоўскае насельніцтва, у Вільні большасць складае нелітоўскае насельніцтва. Але Савецкі ўрад лічыўся з тым, што горад Вільня, які Польшай быў "адлучаны", павінен належаць Літве, як такі горад, з якім звязана, з аднаго боку, гістарычнае мінулае Літоўскай дзяржавы, а з другога — спадзяванні літоўскага народа» [6].

Кіраўніцтва Беларусі не толькі не маўчала, а нават яе кіраўнік П. К. Панамарэнка ад імя ўрада і Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, ЦК КП(б)Б на сёмай сесіі Вярхоўнага Савета СССР першага склікання ўнёс прапанову аб далучэнні да Літоўскай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Свянцянскага раёна і часткі тэрыторыі з пераважна літоўскім насельніцтвам Відзаўскага, Гадуцішскага, Астравецкага, Воранаўскага і Радунскага раёнаў. Усяго ў 1940 г. было перададзена 2,6 тыс. кв. км беларускай зямлі з насельніцтвам 65,0 тыс. чалавек [7]. У «падзяку» за гэта ў гады Вялікай Айчыннай вайны летувісы накіравалі у дапамогу Гітлеру на савецкую тэрыторыю 22 батальёны сваіх карнікаў.

Раздача беларускіх зямель працягвалася і пасля Вялікай Айчыннай вайны. 16 жніўня 1945 г. СССР перадаў Польшы 17 раёнаў Беласточыны і 3 раёны Брэсцкай вобласці. Адыходзілі землі памерам 14 311 кв. км, у якіх пражывала каля 1 млн чалавек. 17 жніўня 1946 г. было перададзена яшчэ 10 населенных пунктаў, у 1949-м — 19, у 1955-м — 34 паселішчы [8, с. 129]. У выніку такіх перадач Польшчы адышлі значныя тэрыторыі спрадвечных беларускіх зямель. Са стратай Вільні і Віленшчыны, Беласточчыны беларускі народ згубіў важныя гістарычныя цэнтры развіцця беларускай культуры, важныя генератары беларускай нацыянальнай ідэі.

Не зусім добрае адбывалася і пры вызначэнні межаў і з Украінскай ССР. Размежаванне праходзіла па лініі адміністрацыйнага падзелу паміж былымі Мінскай, Гродзенскай і Валынскай губернямі. Пры размежаванні М. С. Хрушчоў, на той час Першы сакратар ЦК КПУ, жадаў далучыць да Украіны заходнія раёны Беларусі з гарадамі Брэст, Кобрын, Лунінец, Пінск, Пружаны, Столін і землі Белавежскай пушчы. Адным з аргументаў гэтага з'яўлялася сцвярджэнне М. С. Хрушчова аб тым, што на Украіне мала лясоў, а для шахтаў Данбаса патрэбны падпоркі. Супраць гэтага выступіў П. К. Панамарэнка. І. В. Сталін, каб спыніць спрэчкі, на прапанаванай карце чыркнуў алоўкам, пакінуўшы Беларусі названыя гарады і ў той жа час аддаўшы Украіне значныя беларускія землі.

Дзеля праўды трэба адзначыць, што пасля перадачы ў 1954 г. Крыма Украіне М. С. Хрушчоў прапанаваў перадаць Беларусі Калінінградскую вобласць, аддаўшы пры гэтым той жа Літве горад Гродна. На карце нават быў нарысаваны «калідор», які злучаў бы Беларусь з гэтай вобласцю. Калі б такое здарылася, дык БССР атрымала бы выхад да Балтыйскага мора, што мела б вельмі вялікае значэнне для рэспублікі.

У выніку гандлю беларускімі землямі Беларусь з'явілася адзінай у Еўропе краінай, якая паклала на плаху перамогі «толькі над фашызмам» 2,7 млн сваіх сыноў і дачок, але нічога не атрымала ў якасці пераможцы, а разам з людзьмі страціла свае землі. «Краінай пераможцай» аказалася Літва (Жамойція), якая ваявала пераважна на баку Германіі. Узнікае пытанне, адкуль такая «вялікая любоў» савецкіх уладаў да беларусаў, іх зямлі.

Здзекі над беларускай зямлёй на гэтым не закончылася. Асабліва гэта праявілася ў час Чарнобыльскай аварыі 26 красавіка 1986 г. Акрамя таго, што радыеактыўныя хмары накіраваліся на тэрыторыю Беларусі, яшчэ і да гэтага на беларускіх землях будаваліся сховішчы радыеактыўных адходаў з Украіны. У 60—80-я гг. XX ст. ствараліся сховішчы ядахімікатаў для еўрапейскай часткі СССР, што ва ўмовах неглыбокага ўзроўню залягання грунтовых вод забруджавала імі навакольнае асяроддзе. Вынікам абодвух гэтых працэсаў з'явіўся рост анкалагічных захворванняў і многае іншае. Беларускае кіраўніцтва маўчала, заспакойвала людзей. Нядобра, на нашу думку, у адносінах да беларускага народа паступіў і тагачасны кіраўнік Беларусі М. М. Слюнькоў, які адмовіўся ад грошай, выдаткаваных саюзным кіраўніцтвам на мінімізацыю наступстваў аварыі, заявіўшы, што Беларусь справіцца сама. Украіна не адмовілася. Прычына адмовы ў адсутнасці адказнасці за лёс беларускага народа, яго зямлю, што праявіла сябе і ў 1994 г. пры дэмаркацыі мяжы Літвы і Беларусі. Узніклі спрэчкі за станцыю Гадуцішкі, якая быццам бы знаходзілася на літоўскай тэрыторыі, аднак належала беларускай чыгунцы. Спрэчкі закончыліся тым, што беларускае кіраўніцтва бязвыплатна перадала яе Літве.

Суцяшэннем для Беларусі з'явілася перадача ёй у 1964 г. са складу Смаленскай вобласці васьмі вёсак і тэрыторыі плошчай 2 256 гектараў зямлі былой Аслянскай воласці Мсціслаўскага ўезда. Гэтыя землі былі ўключаны ў склад Мсціслаўскага раёна Магілёўскай вобласці.

Важна адзначыць, што тэрыторыя дзяржавы — гэта не проста зямля. Тэрыторыя беларускай дзяржавы, як і тэрыторыя іншых краін з карэнным насельніцтвам, — гэта зямля продкаў, зямля нашых бацькоў, дзяржавы і яе грамадзян і кіраўніцтва, усе яе жыхары павінны ведаць гэта і выступаць у абарону яе не толькі у гады варожых



Рэпазітор БарДУ

нашэсцяў. М. С. Хрушчоў па асабістых матывах перадаў Украіне Крым. Ён жа, як потым і Л. І. Брэжнеў, пераводзілі на Украіну высокатэхналагічныя прадпрыемствы ваенна-прамысловага комплексу і другое. Аднак чаму ўраджэнец з-пад Баранавіч М. Уласік, былы камендант Крамля, амаль што член сям'і І. В. Сталіна, не знайшоў моманту і часу сказаць праўдзіру хоць слова ў абарону беларускага народа, калі ў беларусаў адбіралі землі, дзялілі Усходнюю Прусію. Магчыма, сапраўдным патрыётам беларускага народа з'яўляецца С. П. Каралёў, які добра ведаў аб укладзе сыноў Беларусі ў навуку аб касманаўтыцы, многа зрабіў, каб першымі ў свеце палёт у космас зрабілі выхадцы беларускай зямлі Ю. А. Гагарын, В. В. Церашкова (аб гэтым аўтар асабіста даведаўся, двойчы пабываўшы ў Доме-музеі С. П. Каралёва ў Астанкіне. Там было пачута, што бацька С. П. Каралёва беларус з Магілёва, што, нягледзячы на тое, што С. П. Каралёў нарадзіўся на тэрыторыі сучаснай Украіны, ён лічыў сябе беларусам і адправіў у космас людзей, звязаных з беларускай зямлёй). За гады працяглай паланізацыі, русіфікацыі, саветызацыі, прапаганды ідэалогіі інтэрнацыялізму нацыянальная самасвядомасць беларусаў прытупілася. Ва ўмовах існавання незалежнай суверэннай беларускай дзяржавы фарміраванне і замацаванне, наперакор славутай талерантнасці, нацыянальнай самасвядомасці, пачуцця прыналежнасці да беларускага народа, сваёй дзяржавы, яе тэрытарыяльнай цэласнасці павінна быць прыярытэтным. Асабліва вялікае значэнне ў гэтым павінна адыгрываць выкладанне гісторыі Беларусі ва ўстановах сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі. Зараз, на жаль, мы бачым адваротнае. Пад рознымі абяцанкамі скарачаецца аб'ём гадзін на яе вывучэнне, адменены экзамены. Патрабуюцца і новыя падручнікі, дапаможнікі, якія б больш праўдзіва адлюстроўвалі падзеі. Неабходна ўдакладніць і тэрміны яе выкладання.

Гісторыю Беларусі трэба выкладаць на выпускных ці перадвыпускных курсах, калі студэнты становяцца больш дарослымі, сталымі да асэнсавання гістарычных працэсаў. Неабходна ўвесці абавязковы экзамен, як гэта ёсць у саюзнай Расійскай Федэрацыі. Асабліва важна ведаць сваю гісторыю прадстаўнікам сродкаў масавай інфармацыі, палітыкам. Засвоіўшы гісторыю нашай краіны, мы будзем больш рэльефна бачыць яе мінулае, успрымаць сучаснае і глядзець у будучае. У прыватнасці, прадстаўнікі СМІ добра ведаюць і распавядаюць аб датах нараджэння знакамітых расійскіх і іншых асоб, а аб ураджэнцах Беларусі забываюць. Высокі ўзровень нацыянальнай самасвядомасці, цвёрдая ўпэўненасць у велічы нашага народа — залог нашай будучыні.

**Заключэнне.** Павышэнне ўзроўню нацыянальнай самасвядомасці, засваення патрэбы ў неабходнасці адстойвання сваёй зямлі — гэта важна, аднак недастаткова. У краіне павінна існаваць галоснасць, дзейнічаць аб'яднанні, якія б маглі выступаць у абарону інтэрнаў дзяржавы, яе тэрыторыі, гонару.

На прыкладах фарміравання, змянення тэрыторыі пражывання беларускага народа зроблена спроба абгрунтавання неабходнасці больш прынцыпова адносіцца да пытання фарміравання нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа.

### Спіс цытуемых крыніц


1. Нарыс гісторыі беларускай дзяржаўнасці XXI стагоддзя. Мінск : Беларус. навука, 2008. 615 с.
2. Там жа. С. 60.
3. Саракавік І. А. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі. Минск : Соврем. шк., 2006. 456 с.
4. Новік Я. К., Качалаў І. А., Новік Н. Я. Гісторыя Беларусі. Ад старажытных часоў па 2010 год. Мінск : Выш. шк., 2011. 512 с.
5. Казлоў Л., Цітоў А. Беларусь на сямі рубежах. Мінск : Беларусь, 1993. 70 с.
6. Саракавік І. А. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі. С. 317.
7. Там жа. С. 318.
8. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII — пачатку XXI ст. : у 2 кн. Мінск : Беларус. навука, 2012. Кн. 2. 654 с.


УДК 101.1:316.42

**Цзя Ляньна**
*Учреждение образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств», Минск*

## ПОСТМОДЕРНИЗМ КАК ФИЛОСОФСКАЯ ПАРАДИГМА СОВРЕМЕННОЙ КУЛЬТУРЫ

**Введение.** Постмодернистская трактовка современной западной культуры вызывает огромный научный интерес среди исследователей. Особое внимание учёных к этому явлению наблюдается в отечественной и зарубежной эстетике, философии, искусстве, литературе. В этой связи вопрос об истоках постмодернизма в художественной культуре, несомненно, является актуальным, и решение его имеет важное научное значение [1].

**Основная часть.** В научной литературе понятие «постмодернизм» трактуется двояко: с одной стороны, постмодернизм можно рассматривать как культурное явление, основанное на фундаментальных сущностных идеях модернизма и следующее за ним хронологически; с другой стороны, постмодернизм — это культурное явление, основанное на радикальном преобразовании модернистской культурной традиции. Из этого следует, что в своих главных сущностных чертах постмодернизм является логическим продолжением модернизма, который в своём историческом развитии трансформировался до новых форм и культурных сущностей. Не случайно многие

---

© Цзя Ляньна, 2016



Репозиторий БарГУ